# АДМІРАЛ З МАРКАЎКІ

Ішоў сакавік 1925 года, бралася на вясну. Ноччу яшчэ падмарожвала, а днём звінелі ручаі. Вось-вось чакаўся вылет у блакітнае неба прадвеснікаў цяпла — жаваранкаў. Вечары стаялі цудоўныя. У гэтыя вечары на крутым беразе над Бесяддзю збіраліся юнакі і дзяўчаты, галасістыя маркаўскія пявунні бадзёра распявалі заліхвацкія песні-вяснянкі, хлопцы ліха падсвіствалі.

На гульбішчы і вечарынкі ў Маркаўку часцяком прыходзіла моладзь з Васілёўкі з-за Бесядзі. Маркаўцы ж рабілі ім візіты ў адказ. Гэтыя суседнія вёскі жылі ў даўнім сяброўстве. Маркаўскія хлопцы жаніліся на васілёўскіх прыгажунях, васілёўскія — на маркаўскіх.

У адзін з такіх цудоўных сакавіцкіх вечароў малады настаўнік, які нядаўна быў прысланы ў Маркаўскую пачатковую школу, звярнуўся да моладзі з двух вёсак, што сабралася над Бесяддзю, з прапановай сабрацца ў школе на сходку. Так і зрабілі.

Аляксея Пятровіча Нікеенку юнакі і дзяўчаты слухалі ўважліва, нібы малыя дзеці. А ён захапляюча, цікава расказваў пра камсамол, пра вялікія планы ўздыму культуры народа, яго дабрабыту, пра ідэі марксізма-ленінізма.

Самым «адукаваным» сярод слухачоў быў маркаўскі хлопец Мікола Маскалёў. Ён чытаў газеты, «разбіраўся» ў палітыцы. Таму ён нават не-не ды і дапамагаў настаўніку ў гутарцы.

У той вечар Аляксей Пятровіч прапанаваў моладзі стварыць у вёсцы камсамольскую ячэйку.

Калі ўзнікла пытанне — каго выбраць сакратаром ячэйкі, Мікола Маскалёў прапанаваў кандыдатуру Аляксея Пятровіча. Але той запярэчыў:

— Дарагія мае. Дзякуй Вам за давер. Але я тут чалавек часовы. Я маю намер паступаць сёлета ў інстытут і надоўга паеду адсюль. А ў вас тут і свае палітычна-адукаваныя важакі знойдуцца. Ды вось хоць Мікалай Маскалёў!

Так Мікола і стаў сакратаром камсамольскай ячэйкі.

Першымі камсамольцамі ў вёсцы Маркаўка сталі Іван і Васіль Даўгалёвы, Іван Бургуцін, Восіп Піскуноў, Раман Хомчанка, Лазар і Міхаіл Грачовы, Саламон і Груня Будзянскія, Ева Маскалёва і Галя Хомчанка.

Камсамольская ячэйка разгарнула вялікую работу сярод моладзі і ўсіх сялян вёскі. Рэгулярна праводзіліся камсамольскія сходы. Былі створаны два гурткі: палітычны і драматычны. Палітычным кіраваў сам сакратар камсамольскай ячэйкі Маскалёў, драматычным — Ева Маскалёва.

Маркаўская камсамольская ячэйка хутка праславілася на ўвесь Хоцімскі раён, стала вядомай і ў Калінінскай (Клімавіцкай) акрузе.

У тыя гады, калі вырашалася пытанне індустрыялізацыі краіны, ЦК камсамола накіраваў Мікалая Пятровіча на рабфак у г. Ленінград, пасля заканчэння якога ён паступіў у Ленінградскі політэхнічны інстытут імя М. І. Калініна, які скончыў у 1935 годзе.

І партыя адразу ж пасля інстытута пасылае М. П. Маскалёва на вучобу ў Ваенна-Марскую акадэмію, якую ён з чырвоным дыпломам скончыў у 1939 годзе.

Пасля заканчэння акадэміі Мікалай Пятровіч быў накіраваны ў Германію, дзе выконваў асобыя заданні ў якасці Ваенна-Марскога аташэ. Вярнуўся ён на Радзіму ў маі месяцы, незадоўга да пачатку вайны.

У сярэдзіне чэрвеня 1941 года М. П. Маскалёў быў накіраваны на адзін з абаронных заводаў, дзе прымаў непасрэдны ўдзел у распрацоўцы і стварэнні новай ваеннай тэхнікі. Гэтым займаўся ён і ў грозныя дні Вялікай Айчыннай вайны.

У пасляваенныя гады Мікалай Пятровіч Маскалёў служыў на Паўночным Флоце. Буйны спецыяліст, вучоны, ён на працягу шэрагу гадоў займаўся навукова-даследчай дзейнасцю ў адным з НДІ Ваенна-Марскога Флоту, дзе яму было прысвоена званне контрадмірала-інжынера, і ён быў прызначаны на адказную пасаду начальніка факультэта Ваенна-Марской акадэміі.

Радзіма высока ацаніла працу М. П. Маскалёва — ён быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга і двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі.

Пасля выхаду ў адстаўку ў 1979 годзе Мікалай Пятровіч актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці горада Ленінграда. Шмат гадоў на грамадскіх пачатках працаваў намеснікам старшыні раённага камітэта народнага кантролю Пушкінскага раёна, членам савета па ваенна-патрыятычнаму выхаванню пры райкоме КПСС, старшынёй савета ветэранаў вайны і працы Пушкінскага раёна г. Ленінграда.

Мікалай Пятровіч быў чалавекам вялікай асабістай прывабнасці, высокай культуры, інтэлігентнасці. Калі прыязджаў на адпачынак да бацькі ў вёску, любіў пагаварыць з аднавяскоўцамі, пахадзіць з ружжом па лесе на паляванне — не дзеля здабычы, а для цікавасці і адпачынку на прыродзе.

Контр-адмірал з Маркаўкі Мікалай Пятровіч Маскалёў памёр на 82 годзе жыцця ў кастрычніку мінулага года.

**В. ДАЎГАЛЕЎ.**

**Даўгалёў, В.** Адмірал з Маркаўкі / В. Даўгалёў // Шлях Кастрычніка.— 1990.— 23 лютага.— С. 3.